# Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне памятны спецштэмпель

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне памятны спецштэмпель, які будзе выкарыстоўвацца з 25 красавіка па 2 мая 2025 года для правядзення спецыяльнага памятнага гашэння, прысвечанага XII Нацыянальнай філатэлістычнай выстаўцы «Белфіла-2025».

Месца гашэння – аддзяленне паштовай сувязі № 25 Гродна.

Колер масцікі – сіні.

XII Нацыянальная філатэлістычная выстаўка «Белфіла-2025» прысвечана 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Упершыню нацыянальная філатэлістычная выстаўка «Белфіла» адбылася ў 1999 годзе ў Магілёве. У 2025 годзе нацыянальную выстаўку ўжо трэці раз прымае горад Гродна, які дагэтуль быў сталіцай філатэліі ў 2000 і 2006 гадах.

Выстаўка таксама праводзілася ў Мінску (2002, 2004, 2009, 2015, 2017), Гомелі (2011), Брэсце (2019) і Віцебску (2021).

Да гэтай падзеі РУП «Белпошта» падрыхтавала мастацкі маркіраваны канверт з літарнай маркай «А».

Дызайн праекта Марыны Крэзо.

**Source URL:**
*https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/ministerstva-suvyazi-i-infarmatyzacyi-respubliki-belarus-vypuskae-u-abarachenne-pamyatny*